ISSN 2072-8468
ИННОВАЦИОННЫЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ
http://elibrary.miu.by/journals!/item.iot.html

Пілецкі, В.А. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі: узнікненне і пачатковы этап станаўлення / В.А. Пілецкі // Инновационные образовательные технологии. – 2014. – № 1 (37). – С. 65–70.

УДК 94 (476)

# ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: УЗНІКНЕННЕ І ПАЧАТКОВЫ ЭТАП СТАНАЎЛЕННЯ

Пілецкі В.А.[a]

**Аннотация**
Прааналізавана зараджэнне і станаўленне гістарычна першаснай дзяржаўнасці на беларускіх землях. Паказана спецыфіка працэсу ўсталявання раннефеадальных дзяржаў на тэрыторыі Беларусі, і своеасаблівасць дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях. Разгледжаны важнейшыя здзяйсненні падчас кіравання асобных князёў на Полаччыне. Дадзена кароткая характарыстыка ранняга этапу гісторыі эвалюцыі ранефеадальнай дзяржаўнасці на Поўдні Беларусі з цэнтрам у Тураве. Выяўлены перыяды незалежнасці княстваў, тэрыторыі якіх знаходзіліся ў межах Беларусі.
**Ключевые слова:** князь, веча, летапіс, славяне, балты, крывічы, дрыгавічы, палачане, сімбіёз, этнас, дынастыя, рабычыч, дружына, ураднікі, крыжакі, рэванш, сарацыны.
**Веб:** http://elibrary.miu.by/journals!/item.iot/issue.37/article.11.html
**Поступила в редакцию:** 18.12.2013.

# FIRST STATES ON BELARUS TERRITORY: APPEARANCE AND INITIAL STAGES OF DEVELOPMENT

Piletski V.A.[a]

**Abstract**
The article analyzes the origin and development of first states on the territory of Belarus. It describes the peculiarity of the process of feudal states origin in Belarus and their features. The main achievements of some Polotsk grand princes are shown. The article also contains a brief description of the initial stage of feudal state development in the South of Belarus with its centre in Turau. The author names the independence periods of states which were within Belarus.
**Keywords:** grand prince, popular assembly, chronicle, the Slavs, the Balts, Krivichs, Dregovichs, Polochans, symbiosis, ethnos, dynasty, slave, prince's armed force, officials, crusader, revanche, the Saracens.
**Web:** http://elibrary.miu.by/journals!/item.iot/issue.37/article.11.html
**Received:** 18.12.2013.

Найстаражытнейшая дзяржаўнасць на тэрыторыі Усходняй Еўропы, месцы рассялення беларускага, рускага і ўкраінскага народаў, як сведчаць летапісы, распачалася ў IX ст. нашай эры. Самы старажытны з іх «Аповесць мінулых гадоў» (*рус.*: Повесть временных лет) паведамляе пра першыя княствы на тэрыторыі сучасных Беларусі, Расіі і Украіны. Ва ўводнай (недатаванай) частцы летапісу (датаванне пачынаецца з 852 г.) летапісец паведамляў, што — паляне, драўляне, славене, а таксама дрыгавічы і

[a] *Пілецкі Віктар Аляксандравіч*, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і тэорыі права Мінскага інстытута кіравання,
*Piletsky Viktar Alexandrovich*, Grand PhD in History, Associate Professor, head of the Department of History and Theory of Law, Minsk Institute of Management,
ekonhistbel@mail.ru

палачане мелі свае племянныя княжанні — правобраз першапачатковага дзяржаўнага ўтварэння [1, с. 10]. Найбольшымі сярод іх былі: Кіеўскае (сучасныя землі Украіны, дзе ў той час пражывалі славянскія племянныя саюзы: паляне і драўляне); Полацкае (сучасныя землі Беларусі, заселеныя крывічамі і палачанамі); Наўгародскае (сучасныя землі Расіі, дзе пражываў славянскі племянны саюз: славене-наўгародцы).

Славяне былі прышлым (не карэнным) насельніцтвам. Да прыходу славян на тэрыторыю Беларусі, што адбыўся з-за так званага «Вялікага перасялення народаў» у VII—VIII стст. н.э., тут пражывала мясцовае балцкае насельніцтва. Славяне сяліліся на свабодных месцах, чаму спрыяла нізкая шчыльнасць насельніцтва, і ў выніку сумеснага пражывання з балтамі пачыналася іх шлюбна-роднаснае мяшанне (сімбіёз) [2]. У выніку гэтага працэсу адбылося ўтварэнне беларускага этнасу. Аналагічнае мяшанне (сімбіёз) славян з карэнным фіна-вугорскім насельніцтвам на тэрыторыі Расіі паслужыла прычынай з'яўлення рускага этнасу, а на тэрыторыі Украіны мяшанне славян з мясцовым скіфа-сармацкім насельніцтвам прывяло да ўтварэння ўкраінскага этнасу.

Самымі стражытнымі першадзяржавамі-княствамі (на тэрыторыі рассялення беларусаў), што існавалі з IX ст., былі: Полацкае, Смаленскае і Тураўскае. Пазней, у X—XI стст. летапіс называе ўжо Віцебскае, Менскае, Друцкае, Мсціслаўскае, Слуцкае, Клецкае, Новагародскае, Ізяслаўскае і іншыя княствы. Станаўленне найранейшага з іх пачалося ў VIII—IX стст. вакол горада Полацка на р. Заходняя Дзвіна. Тут пачало фарміравацца аб'яднанне крывічоў, якое ў далейшымператварылася ў самастойную тэрытарыяльную, палітычную і эканамічную адзінку. Першыя летапісныя звесткі аб Полацку адносяцца да 862 года.

У першай палове IX ст. назіраўся працэс усталявання Полацкай зямлі ў пэўных геаграфічных межах і пачалося афармленне яе дзяржаўнасці. Сваім раннім узнікненнем і інтэнсіўным развіццём Полацкая зямля ў многім абавязана міжнародным водным гандлёвым шляхам, якія праходзілі па яе тэрыторыі. Кантроль над грузапатокамі, відаць, даваў Полацку значныя прыбыткі на станаўленне дзяржавы. Буйнейшы гандлёвы шлях «з вараг у грэкі» звязваў рэгіён Скандынавіі і Прыбалтыкі на Балтыйскім моры з рэгіёнам Прычарнамор'я, Візантыйскай імперыяй і арабскім Усходам. Ён праходзіў па сістэме рэк праз Паўночную Русь (Наўгародчыну), тэрыторыю Беларусі (па р. Днепр) і Паўднёвую Русь (Кіеўшчыну) у Чорнае мора. Галоўнай жыццёвай артэрыяй Полацкага княства стала рака Заходняя Дзвіна.

Кіеў, Полацк і Ноўгарад сапернічалі паміж сабой за аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель. Пры гэтым у Полацка было адначасова як выйгрышнае («сярэдзіннае»), так і даволі ўразлівае (прыдатнае для нападу) становішча. Ужо ў 865 годзе (паводле некаторых звестак у 867 г.) кіеўскія князі Аскольд і Дзір ажыццявілі ваенны паход на палачан і «прынеслі ім шмат бяды» [3, с. 9]. Паход, відаць, быў арганізаваны з мэтай парваць саюзніцкія адносіны Полацка з Ноўгарадам, якія намеціліся, па меркаванні расійскага гісторыка В.М. Тацішчава, яшчэ з часоў Рурыка. Тады, калі палачане «...согласясь с новгородцы, демократию (вече) ввели...» [4, с. 16].

Утварэнне Кіеўскай Русі адбылося пазней (у 882 г.) падчас заваявання Алегам, часовым кіраўніком Ноўгарада (апякуном малалетняга князя Ігара Рурыкавіча), Кіеўскага княства і тэрыторый смаленска-чарнігаўскага памежжа. У склад пачатковых тэрыторый Кіеўскай Русі увайшлі, такім чынам, Кіеўскае, Чарнігаўскае, Смаленскае княствы і Наўгародская зямля.

Пра ўключэнне Полацка ў склад Кіеўскай Русі ў летапісе звесткі адсутнічаюць. Шэраг гісторыкаў лічаць, што Полацк быў суседняй і саюзнай Кіеўскай Русі дзяржавай. Тым больш што Полацк і землі, якія яму належалі, знаходзіліся ў пастаянных эканамічных і палітычных сувязях з кіеўскімі князямі. Наконт гэтага ёсць некалькі ўспамінаў у летапісе. У першым з іх гаворыцца аб удзеле крывічоў у сумесным паходзе (у 882 г.) будучага кіеўскага князя Алега на Смаленск. У 907 г. князь Алег здейсніў паход на Канстантынопаль, у якім удзельнічалі і палачане. Пасля заключэння міру паміж Кіеўскай дзяржавай і Візантыяй кожны ўдзельнік атрымаў грашовае ўзнагароджанне, а асобныя (відаць найбольш уплывовыя) гарады, у тым ліку і Полацк, — дадатковыя ўзнагароды.

Увогуле, падчас вывучэння пытання аб дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, меркаванні навукоўцаў разыходзяцца. Адны з іх, зыходзячы з традыцыйнага меркавання царска-расійскай і савецкай гістарыяграфіі лічаць, што Полацкае княства ўваходзіла ў склад Кіеўскай Русі. Разам з тым, па сведчанні гістарычных крыніц, вядома, што адносіны з ёю былі намінальнымі і абмяжоўваліся толькі ўдзелам Полацка ва ўзаемавыгадных ваенных мерапрыемствах [5, с. 7—30].

Іншыя гісторыкі, абапіраючыся на поўную адсутнасць якіх-небудзь сведчанняў летапісца пра факт уваходжання Полацка ў склад Кіеўскай Русі пасля яе утварэння (у 882 г.), лічаць, што старажытнае Полацкае княства было самастойнай дзяр-

жавай і знаходзілася ў суседскіх, саюзніцкіх адносінах з Кіевам.

У канцы X ст. (прыкладна з 70-х гг.) у Полацку пачаў княжыць Рагвалод. Ён адзінаўладна кіраваў усёй Полацкай зямлёй, да саюзу з якой імкнуліся і наўгародскі князь Уладзімір, і кіеўскі князь Яраполк. Яны абодва хацелі ўстанавіць саюз з Полацкам праз шлюбна-дынастычныя адносіны і пасваталіся да полацкай князёўны Рагнеды. Але дзяўчына дала згоду на шлюб з кіеўскім Яраполкам (што адпавядала курсу Полацка на саюзніцкія адносіны з Кіевам). Наўгародскаму Уладзіміру яна адмовіла, сказаўшы: «Не хочу роззути робичича», чым падкрэсліла факт яго пазашлюбнага (незаконнага) нараджэння, якое па тагачасных законах звычаёвага права не дазваляла яму займаць пасаду кіраўніка княства.

У 980 г. Уладзіміру Святаславічу, які змагаўся са сваім братам Яраполкам за кіеўскі трон, удалося на непрацяглы перыяд (каля 8 гадоў) захапіць Полацк. Рагвалод быў забіты, яго дачка Рагнеда гвалтам узята Уладзімірам у жонкі. Яна нарадзіла сыноў Ізяслава, Мсціслава і Яраслава. Згодна з паданнем, якое перададзена ў летапісе, Рагнеда (каля 988 г.) зрабіла няўдалы замах на жыццё Уладзіміра з мэтай помсты за забойства бацькі (Рагвалода) і братоў. Ад пакарання за гэта яе выратаваў 8-гадовы Ізяслаў, які заступіўся за маці (бацькам Ізяслава, па меркаванні некаторых гісторыкаў, быў забіты Уладзімірам кіеўскі князь Яраполк). У выніку канфлікту Уладзімір быў вымушаны адправіць Рагнеду з сынам у адзін з замкаў на тэрыторыі Беларусі, які пазней стаў вядомы як горад Ізяслаўль (Заслаўе). Ізяслаў у гэты час быў запрошаны палачанамі па княжанне ў Полацк. Такім чынам, прыблізна праз 8—10 гадоў (пасля забойства Рагвалода) была адноўлена незалежнасць Полацкай зямлі і кіруючая дынастыя яе князёў.

Самастойнасць полацкай дынастыі, на думку многіх даследчыкаў, падкрэслена тым, што на працягу доўгага гістарычнага перыяду эвалюцыі княства полацкія князі перадавалі трон ад бацькі да сына, а ў летапісах іх называюць не інакш як Рагвалодавічы альбо Ізяславічы. Ні адзін летапісец, ніколі, не змешваў іх з кіеўскімі князямі, нягледзячы на тое, што Рагнеда некаторы час і была жонкай кіеўскага князя Уладзіміра.

У заканадаўчых адносінах Полацкая зямля кіравалася вечам, а ў выканаўчых — князем і яго дружынай. Веча прызначала князя на трон, дамаўлялася з ім аб умовах яго княжання (пазней, нават шляхам падпісання т.зв «дагаворнай граматы»), прымала найважнейшыя для жыцця краіны рашэнні: вызначала падаткі; аб'яўляла вайну і заключала мір; прызначала на пасады вышэйшых ураднікаў (чыноўнікаў). У выпадку парушэння князем дагавора, веча пазбаўляла яго княжацкіх паўнамоцтваў (здымала з пасады).

У пералік функцый княжацкай (выканаўчай) улады ўваходзіла абарона тэрыторый краіны, адміністрацыйнае кіраванне землямі княства, вярхоўнае судаводства, збор падаткаў і іх размеркаванне на патрэбы дзяржавы, а таксама інш. Уступленне князя на прастол суправаджалася строга вызначаным рытуалам прынясення клятвы. Новы князь прысягаў абараняць дзяржаву і інтарэсы яе жыхароў [6, с. 192].

Ізяслаў, якога летапісец назваў «кніжнік», падкрэсліваючы яго сувязь з пачаткам хрысціянізацыі беларускіх зямель, кіраваў Полацкам у 988—1001 гг. Пасля яго смерці адзіным пераемнікам княжацкай улады ў Полацку становіцца яго малодшы сын Брачыслаў Ізяславіч. Князь Брачыслаў (1003—1044) і асабліва яго сын Усяслаў (1044—1101) праводзілі цалкам самастойную палітыку, якая ў значнай ступені была накіравана на суперніцтва з Кіеўскай Руссю. У барацьбе з кіеўскім князем Яраславам Мудрым за Ноўгарад (бітва на р. Судамір у 1021 г.) Брачыслаў дабіўся перадачы яму гарадоў Віцебск і Усвят [7, с. 6—8]. Гэта быў стратэгічна важны (найбольш прыдатны для кіравання грузапатокамі) пункт міжнароднага гандлёвага шляху «з варяг у грэкі» (там дзе адбываліся «волакі» — сухапутнае перамяшчэнне суднаў з адной воднай артэрыі ў іншую). Здзейсненае Брачыславам азначала атрыманне Полацкім княствам выключных правоў на гандлёвы шлях і даходы з яго.

Па Заходняй Дзвіне палачане гандлявалі з Прыбалтыкай і Смаленшчынай, а таксама ажыццяўлялі экспансію (пашырэнне сваіх тэрыторый) на прыбалтыйскія землі, засноўваючы там цэнтры па збору даніны і кіраванню падуладным насельніцтвам латгалаў, ліваў, земгалаў, і інш. Створаныя пазней княствы Герцыке і Кукенойс выконвалі ролю фарпоста палітыка-эканамічных інтарэсаў Полацка ў Падзвінні і кіраваліся выхадцамі з полацкай княжацкай дынастыі. Паводле меркавання даследчыкаў, менавіта Брачыслаў заснаваў горад Браслаў, які размяшчаўся на мяжы рассялення балцкай і славянскай супольнасцей.

Усяслаў Брачыславіч, які атрымаў прозвішча Чарадзей, некаторы час падтрымліваў мірныя адносіны з кіеўскімі князямі. Аднак як толькі паміж апошнімі пачаліся ўсобіцы, разгарнуў барацьбу за падпарадкаванасць Полацку Паўночнай Русі. У 1065 г. полацкія дружыны асаджалі Пскоў, а ў 1066 г. штур-

мам узялі Ноўгарад. У адказ на гэта тры князі, браты Яраславічы на чале з кіеўскім князем Ізяславам, пайшлі на Полацкую зямлю і захапілі Менск. 3 сакавіка 1067 г. на беразе ракі Няміга адбылася страшэнная бітва. Кіеўляне перамаглі. Усяслаў быў вымушаны адступіць. Нягледзячы на больш выйгрышнае становішча, князі Яраславічы самі прапанавалі мір і запрасілі Усяслава на перамовы, гарантуючы яму бяспеку прысягай крыжацалавання. Усяслаў паверыў святой клятве і адправіўся да іх у палявы лагер непадалёк ад Оршы з двума сынамі і надзеяй на паразуменне. Аднак Яраславічы пайшлі на клятвапарушэнне. Яны схапілі Усяслава і адвезлі ў Кіеў, дзе кінулі ў турму. У 1068 г. жыхары Кіева, якія паўсталі супраць кіеўскага князя Ізяслава, вызвалілі Усяслава і запрасілі яго стаць іх князем. Ён спачатку згадзіўся, але праз сем месяцаў, калі паўстала задача абараняць горад ад польскіх наёмнікаў, сабраных Ізяславам Яраславічам, вырашыў за лепшае вярнуцца на радзіму і абараняць яе незалежнасць.

Князь Усяслаў Чарадзей займае ганаровае месца ў гісторыі нашай краіны. Падчас яго кіравання Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці, а таксама навышэйшай ступені незалежнасці [8, с. 38]. У той час, калі ў астатніх усходнеславянскіх княствах з другой паловы XI ст. пачаўся перыяд феадальнай раздробленнасці, які суправаджаўся актыўным дзяленнем тэрыторыі Кіеўскай Русі на ўдзелы, Полацкая зямля заставалася цэласнай дзяржавай з адзіным цэнтрам кіравання ў Полацку. У гэты перыяд адбыліся такія значныя падзеі для Полацкага княства, як замацаванне за Полацкам Ніжняга Падзвіння (заснаванне Герцыке і Кукенойса), будаўніцтва Сафійскага сабора, аднаўленне Менска, барацьба за пашырэнне ўсходняй мяжы княства.

Пасля смерці Усяслава ў пачатку XII ст. (1101 г.) да ўлады прыйшлі яго сыны. Усяго вядома шэсць сыноў князя: Барыс-Рагвалод, Давыд, Глеб, Раман, Святаслаў-Георгій, Расціслаў. Гэты перыяд у гісторыі Беларусі прынята называць пачаткам феадальнай раздробленнасці. Хоць тады яшчэ, як сведчыць летапіс, усё ж былі сумесныя акцыі полацкіх князёў у барацьбе з іншымі землямі. Так, напрыклад, вядомы паход палачан на продкаў сучасных латышоў прыбалтыйскіх земгалаў у 1106 г. і некаторыя іншыя. Найбольш моцным з удзелаў Полацкай зямлі стала Менскае княства. Тут княжыў Глеб Усяславіч, які праводзіў палітыку ўзвышэння Менска і ўсю сваю энергію накіроўваў на ўмацаванне і пашырэнне межаў Менскага княства. Гэта выклікала нездавальненне Кіева, прывяло да войнаў, паланення і забойства Глеба ў кіеўскай турме па прыказу князя Уладзіміра Манамаха.

Адносіны Полацка з князямі Кіеўскай Русі ў першай трэці XII ст. заставаліся вельмі напружанымі. Прычынай чарговаму канфлікту паслужыла адмова полацкіх князёў на прапанову кіеўскага князя Мсціслава (сына Манамаха), выказаную ў прыказным тоне, адстойваць у вайне з полаўцамі кіеўскія геапалітычныя інтарэсы. Расійскі гісторык В.М. Тацішчаў прывёў словы палачан у адказ кіеўскаму князю: «Ты с Боняком Шелудяком здравствуйте оба и управляйтесь сами, а мы имеем дома что делать» [9, с. 142].

Пасля перамогі над полаўцамі ў 1127 г. Кіеў сабраў супраць полацкай дзяржавы вялікую кааліцыю, у склад якой увайшлі шматлікія княствы ўсходнееўрапейскага рэгіёну. Полацкае веча не ў стане было супрацьстаяць такой вялікай сіле, і таму вымушана было аддаць частку князёў (прадстаўнікоў полацкай дынастыі) у якасці палонных кіеўскаму князю, які прагнуў рэваншу за непаважны тон выказвання палачан. Князёў адправілі ў ссылку (у Візантыю). Там яны служылі ў войску, абараняючы землі імперыі ад сарацынаў (арабаў), потым вярнуліся.

Тым не менш палітычнае жыццё Полацка не спынілася. На трон Полацкага княства па волі веча быў прызначаны брат знакамітай хрысціянскай дзяячкі Беларусі, Еўфрасінні Полацкай — Васілька Святаслававіч-Георгіевіч. Дзякуючы яму, Полацк ізноў аднавіў сваю самастойнасць. Гэта выявілася асабліва пасля смерці кіеўскага князя Мсціслава (1132 г.). На прастоле ў Кіеўскай Русі, у той час (пасля непрацяглага княжання Яраполка), аказаўся Усевалад Ольгавіч. Змена князёў у Кіеве спрыяла ўмацаванню палітычна-дзяржаўнай стабільнасці Полацка. Прычым Васілька Святаславіч-Георгіевіч аказаўся мудрым палітыкам і дзяржаўным дзеячом. Ён завязаў сяброўскія адносіны з Ноўгарадам, і нават Кіеў, пазіцыі якога былі страчаны, вымушаны быў заключыць з полацкім князем дынастычны шлюб. У 1143 годзе дачка Васількі была аддадзена за сына кіеўскага князя Усевалада [10, с. 230].

Унутранае жыццё Полацка ў гэты час развівалася сваім шляхам. У 1151 годзе Полацкае веча выгнала князя Рагвалода Барысавіча і выбрала князем менскага Расціслава Глебавіча. А ў 1162 годзе ва ўладных структурах ізноў адбыліся змены. Палачане выбралі князем Усяслава Васількавіча, які кіраваў з перапынкамі ажно да 1186 года.

З 80-х гадоў XII ст. у жыцці палачан, як дарэчы і ў жыцці ўсяго насельніцтва

Прыбалтыкі і Усходняй Еўропы цалкам, распачаўся новы этап, характэрны вострай неабходнасцю змагання за сваю незалежнасць. Справа ў тым, што ў 1186 г. на бераг Лівоніі высадзіўся каталіцкі прапаведнік Мейнард (святар ордэна св.Аўгусціна). Полацкі князь, на той час гэта быў Уладзімір (гісторык М.І. Ермаловіч называе яго «Валодша»), «па дабраце душэўнай», а можа і па наіўнасці, што даволі небяспечна для дзяржаўнага дзеяча, дазволіў яму «мірна» прапаведаваць хрысціянства язычнікам летапіснай Латгаліі. З гэтага часу пачалася прысутнасць крыжакоў у Прыбалтыцы, што была аплачана пазней дзесяткамі тысяч жыццяў прадстаўнікоў беларускага і рускага народаў, якія імкнуліся адстаяць свае землі ад крыжацкай экспансіі.

У XII ст. Полацкая зямля складалася з 10 удзельных княстваў: Полацкага, Менскага, Ізяслаўскага, Віцебскага, Лукомскага, Друцкага, Лагожскага, Віленскага, Кукенойскага і Герцыкскага, — улада ў якіх, абмежаваная вечам, належала прадстаўнікам полацкай княжацкай дынастыі. Феадальная раздробленасць, спрэчкі і варожасць князёў аслаблялі Полацкую зямлю.

Пачынаючы з XIII ст., на пярэдні план у дзяржаваўтваральным працэсе на беларускіх землях паступова пачало выходзіць Панямонне. У 1240-х гадах, там, на заходнебеларускіх землях з цэнтрам у г. Наваградак, пачалося ўтварэнне новай, цяпер ужо беларуска-літоўскай, дзяржавы ВКЛ. Гэта была супольная дзяржава двух народаў, якая праз некаторы час дасягнула ролі адной з самых буйных і ўплывовых еўрапейскіх краін. У другой палове XIII ст. Полацкае княства дабравольна (на ўмовах «старыны не рушыць») увайшло ў склад ВКЛ.

**Тураўскае княства** прымыкала да межаў Полацкай зямлі і знаходзілася на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі ў басейне Прыпяці. Першапачатковым яго палітычным цэнтрам быў г. Тураў, дзе кіраўніком быў напалову легендарны князь Тур. Некаторыя гісторыкі лічаць яго братам полацкага князя Рагвалода і сынам полацкай княгіні Прадславы, якая ўпамінаецца ў дагаворы з Візантыяй у 944 г. [11, с. 70—75]. Калі гэта было сапраўды так (як мяркуе гісторык М.І. Ермаловіч), то беларускія землі нават на самым пачатку сваёй палітычнай гісторыі мелі дзяржаўнае адзінства, што з'яўляецца даволі паказальным і ў пэўным сэнсе сімвалічным фактам. Буйнымі гарадамі Тураўскага княства былі Пінск і Бярэсце (*суч.* Брэст), меншымі — Мазыр, Брагін, Рагачоў, Слуцк, Клецк, Кобрын, Камянец, Драгічын Надбужны і інш.

Тураў упершыню ўпамінааецца ў летапісе пад 980 годам. Тураўская зямля, у асноўным, адпавядала тэрыторыі рассялення дрыгавічоў, дзе таксама ўзнікла першадзяржаўнае утварэнне — племяннoе княжанне. Самы старажытны летапіс «Аповесць мінулых гадоў» упамінае пра княжанне дрыгавічоў у недатаванай частцы тэксту, якая адносіцца да перыяду раней 852 года. Іншыя звесткі пра эвалюцыю княства ў перыяд да 980 г. у летапісе адсутнічаюць. Гісторыкі лічаць што яно развівалася ў якасці самастойнай дзяржаўнай адзінкі без падпарадкавання знешнім сілам. Гэтаму, відаць, спрыяла прыродная адасобленасць Турава рэкамі і балоцістай мясцовасцю.

Пра грамадска-палітычны ўклад у Тураўскім княстве і яго гарадах звестак вельмі мала. Верагодна, што ў Тураве дзейнічала веча, існавала пасада тысяцкага, які ўзначальваў гарадское апалчэнне. У Тураве дзейнічаў таксама і пасаднік (пра гэта сведчыць Іпацьеўскі летапіс). Знаходжанне ў горадзе адначасова князя і пасадніка, акрамя Ноўгарада Вялікага, — з'ява незвычайная для іншых гарадоў. Аб існаванні пасадніка ў Полацку звестак няма. Такое параўнанне сведчыць пра асаблівасці грамадска-палітычнага ладу ў Тураўскім княстве.

Пасля падзей 980 г. (забойства полацкага Рагвалода і кіеўскага Яраполка Уладзімірам) Тураў трапіў у арбіту кіеўскай палітыкі. У 987—1019 гг. кіраўніком Тураўскага княства быў Святаполк, сын забітага Уладзімірам кіеўскага князя Яраполка. У 1015 г. ён ажаніўся з польскай княжной, дачкой Баляслава Харобрага (яна прыехала ў Тураў са сваім духоўнікам, каталіцкім біскупам Рэйнбергам), што, відаць, дэманстравала намер Тураўскага веча аднавіць сваю ранейшую незалежнасць і адасобіцца ад Кіева. Пасля смерці Святаполка (у 1019 г.) Тураўская зямля знаходзілася ў цесным палітычным кантакце з Кіевам. Аднак у 50-я гг. XI ст. (з 1052 — па 1113 гг.) Тураў выйшаў з падпарадкавання Кіеву, і ў ім усталявалася самастойная княжацкая дынастыя Ізяславічаў.

У 1113 г. новы кіеўскі князь Уладзімір Манамах устанавіў у Тураве прамое кіеўскае кіраванне, але з 1158 г. тураўскім князем стаў Юрый Яраславіч, прадстаўнік тураўскай дынастыі Ізяславічаў, які ўдала адстойваў незалежнасць Тураўскага княства і супернічаў з Кіевам. Пасля Юрыя Яраславіча (памёр у 1162 г.) у Тураве кіравалі яго нашчадкі. У пачатку XIII ст. Тураўскае княства страціла сваё ранейшае палітычнае значэнне. Усё большую вагу набываў Пінск, які станавіўся па-сутнасці другой сталіцай княства. У сярэдзіне XIII ст. пінчукі прынялі самы актыўны ўдзел ва ўтварэнні ВКЛ і з гэтага часу турава-пінскія землі сталі часткай гэтай дзяржавы.

Менавіта з пінскім войскам, а таксама ў саюзе з полацкімі войскамі Таўцівіла, сапраўдны ўтваральнік пачатковага тэрытарыяльнага статус-кво ВКЛ, сын Міндоўга Войшалк, пасля ўрэгулявання канфлікта з суседзямі, вызванага далучэннем зямель летапіснай Літвы да Наваградскага княства, аднавіў сваю ўладу над тронам будучай беларуска-літоўскай дзяржавы (у 1258 г.), выгнаўшы адтуль Рамана, сына Данілы Галіцкага.

Завяршаючы сказанае, можна адзначыць, што згодна з паведамленнямі самага старажытнага летапісу «Аповесць мінулых гадоў» першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі ўзніклі ў першай палове IX ст. н.э. Праобразам дзяржаўнасці тут былі раннефеадальныя княствы. Менавіта яны, Полацкае, Смаленскае і Тураўскае, якія размяшчаліся на этнаграфічнай тэрыторыі рассялення беларускага этнасу, з'яўляюцца вытокам дзяржаўнасці, увасабленнем ідэі незалежнасці беларускага народа. Найбольш яркае адлюстраванне гэта ідэя атрымала ў Полацкім княстве — першым з вядомых нам дзяржаўных утварэнняў беларусаў, якое ўзнікла ў канцы 1-га тысячагоддзя н.э., яшчэ да ўзнікнення Кіеўскай Русі. Незалежнасць Полацка, у выніку цяжкіх ваенна-палітычных падзей, захоўвалася на працягу значнага гістарычнага перыяду і сімвалізавала сабой пачатак дзяржаўнасці, што зарадзілася на беларускіх землях.

## Літаратура/References

1. Повесть временных лет / подг. текста, пер., статьи и коммент. Д.С. Лихачева; под ред. В.П. Адриановой-Перетц. — СПб.: «Наука» РАН, 2007. — 668 с.

Povest vremennykh let / Podg. teksta, perevod, statyi i komment. D.S. Likhacheva; Pod red. V.P. Adrianovoy-Peretts. — Spb.: "Nauka" RAN, 2007. — 668 p.

2. Седов, В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. / В.В. Седов. Сер.: Археология СССР с древнейших времен до средневековья; Под общ. ред. академика Б.А. Рыбакова. — М.: Наука, 1982. — 328 с.

Sedov, V.V. Vostochnyye slavyane v VI—XIII vv. / V.V. Sedov; Seriya: Arkheologiya SSSR s drevneyshikh vremen do srednevekovya / Pod obshch. red. akademika B.A. Rybakova. — M.: Nauka, 1982. — 328 p.

3. Полное собрание русских летописей: в 30 т. (1841—1965). Т. 9.: Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью / подг. к изд. А.Ф. Бычкова. — СПб., 1862. — 282 с.

Polnoye sobtaniye russkikh letopisey: V 30 t. (1841—1965). T. 9.: Letopisnyy sbornik, imenuyemyy Patriarshey ili Nikonovskoy letopisyu / Podg. k izd. A.F. Bychkova. — Spb., 1862. — 282 p.

4. Копысский, З.Ю. Историография БССР (эпоха феодализма): учеб. пособие / З.Ю. Копысский, В.В. Чепко; под ред Я.Н. Мараша. — Минск: Университетское, 1986. — 175 с.

Kopysskiy, Z.Y., Chepko, V.V. Istoriografiya BSSR (epokha feodalizma): Ucheb. posobiye / Z.Y. Kopysskiy, V.V. Chepko / Pod red. Y.N. Marasha. — Minsk: Universitetskoye, 1986. — 175 p.

5. Пілецкі, В.А. Палітычная гісторыя Беларусі IX—XI ст.: паведамленні летапісаў і іх тлумачэнне / В.А. Пілецкі // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання: зб. навук. пр.: у 2 ч. Ч. 1: Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. — Мінск: БДПУ, 2002. — 200 с.

Piletski, V.A. Palitychnaya gistoryya Belarusi IX—XI st.: pavedamlenni letapisau i ikh tlumachenne / V.A. Piletski // Aychynnaya i susvetnaya gistoryya: suchasnyya poglyady i metady dasledavannya: Zb. navuk. pr.: U 2 ch. Ch. 1: Aktualnyya pytanni gistoryi Belarusi. — Minsk: BDPU, 2002. — 200 p.

6. Юхо, Я.А. Дагаворныя граматы / Я.А. Юхо // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 3. Гімназіі — Кадэнцыя. — Мінск: БелЭн, 1996. — 527 с.

Yukho, Y.A. Dagavornyya gramaty / Y.A. Yukho // Entsyklapedyya gistoryi Belarusi. U 6 t. T. 3. Gimnazii — Kadentsyya. — Minsk: BelEn, 1996. — 527 p.

7. Пілецкі, В.А. Да пытання аб адной з «загадак» летапісца ў гістарыяграфіі Полацкай зямлі // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: мат-лы Рэсп. навук-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 сакавіка 2008 г. У 2 ч. Ч. 1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (ад старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.). — Мінск: БДПУ, 2008. — 199 с.

Piletski, V.A. Da pytannya ab adnoy z "zagadak" letapistsa u gistaryyagrafii Polatskay zyamli // Gistaryyagrafiya gistoryi Belarusi, novay i naveyshay gistoryi krain Europy i ZShA: mat-ly Resp. navuk-tearet. kanf., Minsk, 28 sakavika 2008 g. U 2 ch. Ch. 1. Gistaryyagrafiya gistoryi Belarusi (ad starazhytnykh chasou da kastrychnika 1917 g.). — Minsk: BDPU, 2008. — 199 p.

8. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі // Беларус. энцыкл., Нац. арх. Рэсп. Беларусь; пер. з рус. Т.М. Бутэвіч, Т.М. Кароткая, Е.П. Фешчанка. — Мінск: БелЭн, 1994. — 510 с.

Dounar-Zapolski, M.V. Gistoryya Belarusi / M.V. Dounar-Zapolski; Belarus. Entsykl., Nats. arkh. Resp. Belarus; Per. z rus. T.M. Butevich, T.M. Karotkaya, E.P. Feshchanka. — Minsk: BelEn, 1994. — 510 p.

9. Татищев, В.Н. История Российская: в 7 т. / В.Н. Татищев; под ред. С.Н. Валка, М.Н. Тихомирова; Акад. наук СССР; Ин-т истории, Ленингр. отд-ние. — М.; Л.: Академия наук СССР, 1963. — Т. 2. — 349 с.

Tatishchev, V.N. Istoriya Rossiyskaya: V 7 t. / V.N. Tatishchev; pod red. S.N. Valka, M.N. Tikhomirova; Akad. nauk SSSR; In-t istorii, Leningr. otd-niye. — M.; L.: Akademiya nauk SSSR, 1963 — T. 2. — 349 p.

10. Штыхаў, Г.В. Васілька Святаслававіч / Г.В. Штыхаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беліцк — Гімн / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. — Мінск: БелЭн, 1994. — 537 с.

Shtykhau, G.V. Vasilka Svyataslavavich / G.V. Shtykhau // Entsyklapedyya gistoryi Belarusi: U 6 t. T. 2: Belitsk — Gimn / Belarus. Encykl.; Redkal.: B.I. Sachanka (gal. red.) i insh.; Mast. E.E. Zhakevich. — Minsk: BelEn, 1994. — 537 p.

11. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды / М.І. Ермаловіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. — 366 с.

Ermalovich, M.I. Starazhytnaya Belarus: Polatski i novagarodski peryyady / M.I. Ermalovich. — Minsk: Mastatskaya litaratura, 1990. — 366 p.